# МОЙ ГОРАД У БУДУЧЫМ

*Елісева Карына, X клас, СШ 9*

Не перадаць словамі, як моцна я люблю атмасферу роднага горада Оршы, як люблю прайсціся па знаёмых вуліцах, прымым у любы час: ці раніцай, ці апоўдні, ці познім вечарам. Разглядаць будынкі, людзей, прыроду і, што дзіўна, кожны раз знаходзіць для сябе нешта новае. Таму я магу цвёрда сказаць, што Орша не стаіць на месцы ў сваім развіцці! І куды ж гэта яе прывядзе?

Сёння Орша – важная частка Віцебскай вобласці. А ў будучым, я спадзяюся, і ўсёй рэспублікі.Бо дзе яшчэ вырабляюць такія цудоўныя льняныя тканіны? На якім яшчэ кавалку Зямлі можна знайсці такую вялікую колькасць гісторыка – культурных славутасцей? Пачынаючы з езуіцкага калегіума, які выдатна захаваўся, і заканчваючы разабраным па цаглінках Белым Ковелем.

Нельга забывацца і пра сучасныя пабудовы. Побасч з маім домам ужо некалькі гадоў “акультурваюць” бераг Дняпра: высаджаны дрэвы, пракладзены сцяжынкі, пастаўленя лаўкі, ліхтары, скульптуры. І ўсё гэта хараство нясе ў сабе сімвалічны характар, нагадваючы нам пра самую галоўную чалавечую каштоўнасць – сям’ю. Таму і мае назву “Парк сямейных дрэў”. Вось у такім цудоўным месцы я жыву. Аднак гэта толькі маленькая макулінка нашага вялікага (у маіх вачах) горада.

Я ўпэўнена, што ў будучым Оршу чакае вялікі росквіт. Мноства змен накіравана на паляпшэнне ўмоў жыцця для мясцовага насельніцтва, захоўваючы пры гэтым асцярожныя і беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя. Выкарыстоўваючы найноўшыя тэхналогіі, будзе створана нямала новых месцаў, будынкаў грамадскага прызначэння. Асабіста мне вельмі б хацелася ўбачыць у Оршы ўніверсітэт. Гэта б яшчэ больш павялічыла прэстыж маёй малой радзімы.

А што да таго часу, якога я, можа, і не застану? Мы жывём у эпоху інфармацыйных тэхналогій, і наш сусвет развіваецца з вялікай хуткасцю. Таму не дзіўна, што Орша ў якім – небудзь 2222 годзе паўстане перад яе жыхарамі ў стылі кіберпанку, толькі больш мірнага. Уявіце будынкі велізарныя настолькі, што не відаць верхавін, іх паверхня цалкам пакрыта электроннымі экранамі, паз\ўсюль неонавыя шыльды, робаты, механізаваныя часткі цела, адсутнасць гендарных адрозненняў і віртуальная рэальнасць, якая змагла выратаваць людзей ад смерці – усё гэта проста захоплівае дух!

Такім я бачу  не толькі свій родны горад, але і ўвесь сусвет. Магчыма, сэнсу ў межах больш не будзе.Краіны, а разам з імім і гарады, нацыі знікнуць. Застанецца толькі бязмежная зямельная прастора і чалавечае грамадства, гатовае да супрацоўніцтва і новых адкрыццяў.

Карціна атрымалася даволі ўтапічнай, бо мы не можам ведаць. Якія падзеі чакаюць нас наперадзе. Але адно я ведаю дакладна: кожны аршанец з высока ўзнятай галавой і напоўзненымі гонарам грудзьмі зможа заявіць аб месцы, дзе нарадзіўся і вырас, дзе навучыўся разумець і любіць, дзе жыў спакойна, імкнучыся максімальна сябе рэалізаваць. Орша – вось што гэта за месца!

Я спадзяюся, мой родны горад, ты далей будзеш квітнець і развівацца!